## 8 студзеня 2025 г. - 85 гадоў з часу ўтварэння суда Кобрынскага раёна (1940)



Гісторыя суда Кобрынскага раёна бярэ свой пачатак у 1940 годзе, калі на падставе пастановы Брэсцкага аблвыканкама ад 8 студзеня быў утвораны Кобрынскі судовы ўчастак народных судоў. Пастановай Кобрынскага райвыканкама і райкама КПБ у 1940 годзе народным суддзёй Кобрынскага раёна быў зацверджаны Іосіф Рыгоравіч Энцін – першы і адзіны суддзя Кобрынскага судовага ўчастка. У архіўных дакументах, па якіх прайшла нямецка-фашысцкая акупацыя, няма дакладнай даты пачатку работы ўстановы.

На падставе Закона аб Судаўладкаванні СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік Савет Народных Камісараў пастанавіў устанавіць на 1941 годзе ў заходніх абласцях БССР 235 участкаў народных судоў, у тым ліку Дзівінскі і Кобрынскі. У 1941 годзе судовы ўчастак быў рэарганізаваны ў Народны суд Кобрынскага раёна ўпраўлення народнага камісарыята юстыцыі БССР пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў працоўных.

З 26 сакавіка 1946 года – гэта Народны суд Кобрынскага раёна Міністэрства юстыцыі БССР пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў. Захаваўся будынак па вул. Савецкая, 103 (раней – Брэсцкая), у якім у 1949 годзе размясціўся суд. Невялікі аднапавярховы будынак мае багатую гісторыю – пабудаваны ў 1905 годзе памешчыкам Ганам, ён адзін з нямногіх уцалеў у агні ваеннага ліхалецця. Сёння тут размяшчаецца Кобрынскі ТЦСАН. Забудова вул. Савецкая, у тым ліку дом 103, у 2005 годзе ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 113Г000398).

З 1952 года па 7 верасня 1956 года - Народны суд I участка Кобрынскага раёна ўпраўлення Міністэрства юстыцыі БССР пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў працоўных. З 7 верасня 1956 года па 13 студзеня 1995 года - Народны суд Кобрынскага раёна. На працягу паўстагоддзя (1940-1990) у судзе працаваў невялікі калектыў у складзе 2 суддзяў, 2 сакратароў судовага пасяджэння, 2 судовых выканаўцаў і 4 чалавек тэхперсаналу.

По меры развіцця грамадства ў дзяржаве праводзіліся рэформы, у тым ліку судовай сістэмы. Новым этапам станаўлення судовай сістэмы Рэспублікі Беларусь з'яўляецца пачатак 1990-х гадоў, калі рэспубліка атрымала незалежнасць і перад судовай сістэмай былі пастаўлены новыя мэты і задачы. Асноўным актам, які вызначыў пабудову судовай сістэмы на новых прынцыпах, стала Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года.

З 1991 года ў судзе Кобрынскага раёна працавалі тры склады суда і тры судовых выканаўца. З 1994 года суд папоўніўся яшчэ адным складам і на працягу 10 гадоў у нязменным складзе працавалі суддзі С. В. Дзягіль, А. В. Бабаскін, А. П. Марчук, С. А. Каліноўскі.

У 1999 годзе ў заканадаўства Рэспублікі Беларусь былі ўнесены вялікія змены. У кампетэнцыю суда сталі ўваходзіць афармленне скасавання шлюбу, разгляд грамадзянскіх спраў аб усынаўленні, вялікая колькасць дакументаў па крымінальных і грамадзянскіх справах стала афармляцца ў адпаведнасці з Міжнароднымі дагаворамі аб прававой дапамозе, у сувязі з чым была ўведзена новая пасада ў сістэме раённых судоў - кансультант суда Кобрынскага раёна. У мэтах умацавання судовай сістэмы, удасканалення самакіравання суддзяў Рэспублікі Беларусь 5 снежня 1997 года ў Мінску быў праведзены першы з'езд суддзяў Рэспублікі Беларусь.

У Кобрынскім раёне адкрылася перспектыва будаўніцтва новага будынка суда, так як да таго часу калектыў у колькасці 23 чалавек працаваў у невялікім памяшканні. У распараджэнні суддзяў была ўсяго адна зала судовага пасяджэння і сем невялікіх кабінетаў. 18 жніўня 2000 года адбылося ўрачыстае адкрыццё новага будынка суда па вуліцы Інтэрнацыянальнай, 28 з пяццю заламі судовых пасяджэнняў, асобнымі прыёмнымі і прасторнымі кабінетамі суддзяў. Судовыя выканаўцы занялі асобныя кабінеты. Гэта паспрыяла больш эфектыўнай і плённай працы ўсіх спецыялістаў на кожным участку працы суда.

За перыяд існавання арганізацыі найменне суда неаднаразова мянялася. Да 2002 года гэта быў суд г. Кобрына і раёна, з 2002 года і па цяперашні час - суд Кобрынскага раёна. Суд Кобрынскага раёна з'яўляецца судом першай інстанцыі, таму кампетэнтны разглядаць крымінальныя, грамадзянскія і адміністрацыйныя справы. Раённаму суда падсудныя крымінальныя справы, акрамя спраў, падсудных

вышэйшым судам аб найбольш грамадска небяспечных злачынствах.

Вялікая і працаёмкая работа суда Кобрынскага раёна неаднаразова адзначалася падзячнымі пісьмамі і Ганаровымі граматамі Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь і галоўнага ўпраўлення юстыцыі Брэсцкага аблвыканкама. Па паказчыку сярэднямесячнай нагрузкі на суддзю суд Кобрынскага раёна займае другое месца сярод раённых судоў Брэсцкай вобласці. Калектыў па праве можа ганарыцца дасягнутымі вынікамі і вынікамі сваёй працы, а таксама кадрамі, якія выконвалі і сёння выконваюць высакародную місію – ахоўваць законныя інтарэсы як дзяржавы, так і чалавека, забяспечваць справядлівае вырашэнне справы ў разумныя тэрміны.

Суд Кобрынскага раёна з’яўляецца своеасаблівай кузняй кадраў. Вопыт работы тут атрымалі многія спецыялісты, найбольш паспяховыя супрацоўнікі суда Кобрынскага раёна ў свой час дасягнулі кар'ернага росту. Сярод іх - намеснік міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Аляксеевіч Каліноўскі, старшыня Брэсцкага абласнога суда Антон Іванавіч Гушчын, старшыня суда Пружанскага раёна Вадзім Іванавіч Мазоль і многія іншыя.

У розныя гады калектывам суда кіравалі Сяргей Міхайлавіч Бузанаў, Рыгор Сцяпанавіч Судакоў, Надзея Аляксееўна Сіляева, Мікалай Паўлавіч Прыбыш. З 1981 года па 2013 год старшынёй суда была Соф'я Васільеўна Дзягіль, якая без малога 34 гады прапрацавала кіраўніком і пакінула глыбокі след у гісторыі раённага суда. З 2013 года па 2019 год судом Кобрынскага раёна кіраваў Антон Іванавіч Гушчын, з кастрычніка 2019 года суд узначальваў Вадзім Святаслававіч Здановіч.

Сучасны калектыў суда Кобрынскага раёна на чале са старшынёй Таццянай Аляксандраўнай Каберскай - гэта згуртаваная і зладжаная каманда прафесіяналаў, здольная выконваць задачы, пастаўленыя часам, забяспечваць адкрытасць і даступнасць правасуддзя, якасны і аператыўны разгляд крымінальных, грамадзянскіх і адміністрацыйных спраў.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Суду** Кобрынскага раёна (1940) - 85 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 187.

**Зданович, В.** С. На страже закона / [Вадим Зданович ; беседовала] Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 4 снежня (№ 96). — С. 2 : фот.

Беседа с главным судьей Кобринского района В. С. Здановичем.

**Белов, Д.** Правосудие доступно каждому / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2020. — 1 лютага (№ 8). — С. 3 : фот.

Суду Кобринского района — 80 лет.

**Савчук, М.** Софья Дегиль: о трудовых буднях, главных заслугах и житейских испытаниях / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 30 января (№ 5). — С. 4—5 : фот.

Кобринчанка С. В. Дегиль, отдавшая 37 лет работе в судебной системе, рассказывает о житейских и трудовых буднях.

**Вадим Зданович** — председатель суда Кобринского района // Кобрынскі веснік. - 2019. — 6 лістапада. — С. 3 : фот.

**Зданович, В. С.** Вадим Зданович: "Наказание должно быть справедливым" / Вадим Зданович ; интервью провела Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 28 ноября (№ 48). — С. 6 : фот.

**Гущин, А. И.** "Каждый судья рассматривает более 100 дел ежемесячно" / Антон Гущин ; [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2018. — 1 февраля. — С. 6.

Беседа с председателем суда Кобринского района А. Гущиным.

**Гущин, А. И**. "Надо искать компромисс в спорах, даже если они дошли до суда" / Антон Гущин ; [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2018. — 29 ноября (№ 48). — С. 6.

Беседа с председателем суда Кобринского района А. Гущиным.

**Белов, Д.** На страже законности и справедливости / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2016. — 3 снежня (№ 97). — С. 4 : фот.

**Вовк, Ю.** Посудите сами, или власть народных заседателей / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2016. — 4 августа. — С. 2.

Состоялось торжественное принятие присяги народных заседателей Брестского областного суда и суда Кобринского района.

**Дубина, Л.** С правом судить / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. — 10 жніўня. — С. 2.

Прошла церемония принятия присяги народными заседателями Брестского областного суда и суда Кобринского района.

**Белов, Д.** И правосудие - для всех / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2015. - 24 студзеня. —-С. 4.

В нынешнем году суд Кобринского района отмечает свой 75-летний юбилей.

**Богнат, А**. Из истории становления суда Кобринского района / Алла Богнат // Кобрин-информ. – 2015. – 15 января. – С. 6.

**Гущин, А**. Каждому делу - объективное рассмотрение / Антон Гущин ; [беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2015. — 22 жніўня. — С. 9.

Беседа с председателем суда Кобринского района А. Гущиным.

**Савчук, М**. Суду Кобринского района - 75. Из истории становления суда Кобринского района / Маргарита Савчук, Алла Богнат // Кобрин-информ. - 2015. — 15 января. — С. 6.

О коллективе работников районного суда и его истории.

**Гущин, А. И.** Антон Гущин: "Мы призваны защищать законность" : новые назначения / Антон Гущин ; записал Игорь Сидорук // Кобрынскі веснік. - 2013.— 27 ліпеня.— С. 2.

**Савчук, М**. Женщина в судейской мантии / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 20 июня. — С. 4.

14 июня в суде Кобринского района торжественно проводили в почетную отставку председателя суда Софью Васильевну Дегиль.

**Бялоў, Д.** Змагацца за кожнага чалавека / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 14 сакавіка. - С. 3.

Тэма чарговага пасяджэння суда – нядобранадзейнасць сям'і.

**Савчук, М.** Суд в Дивине / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2012. - 5 июля. - С. 4.

Очередное выездное заседание суда в сельские населенные пункты состоялось в Дивине.

**Дзегіль, С.** "Суддзя павінен быць добрым" / Соф'я Дзегіль, [гутарыла Настасся Занько] // Кобрынскі веснік. - 2011. - 3 снежня. - С. 2.

Гутарка са старшынёй Кобрынскага раённага суда С. В. Дзегіль.

**Определены** победители конкурса на приз им. В. Д. Спасовича // Юстыцыя Беларусі. - 2010. - № 5. - С. 5.

Решением Конкурсной комиссии диполами конкурса отмечена С. В. Дегиль, председатель суда Кобринского района.

**Председатель** суда Кобринского района Брестской области С. В. Дегиль // Юстыцыя Беларусі. - 2008. - № 1. - С. 15.

Биографические данные о С. В. Дегиль.

**Савчук, М.** С. А. Калиновский: "Суды стали работать в более жёстком режиме" / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2007. - 6 декабря. - С. 4.

О работе суда Кобринского района.

**Логвинович, А**. По труду – звание и почет / А. Логвинович // Заря. – 2005. – 2 красавіка. – С. 1.

Председатель Коринского районного суда С. Дегиль удостоена звания «Человек года» в правоохранительной сфере.

**Савчук, М.** Человек года в сфере правопорядка / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2005. – 28 апреля. – С. 3.

Председатель Коринского районного суда С. Дегиль удостоена звания «Человек года» в правоохранительной сфере.

**Калиновский, С. А.** Наркодиллеры на скамье обвиняемых / С. А. Калиновский // Кобрин-информ. – 2003. – 30 января. – С. 4.

Судом Кобринского района за 2002 год рассмотрено 24 уголовных дела.

**Хільчук, М**. Закон. Веды. І часцінка сэрца / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 6 снежня. – С. 1.

Аб старшыні суда Кобрынскага раёна С. Дзягіль.

**Савчук, М.** Судья, которую любят / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2002. – 21 ноября. – С. 12.

О С. В. Дегиль, председателе Кобринского суда.

**Пянко, А.** Горад маладзее новымі пабудовамі / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2000. – 23 жніўня. – С. 1.

Аб адкрыцці ў Кобрыне новага будынка суда.

**Пянко, А.** После нового моста в Кобрине сдали новый суд / А. Пянко // Заря. – 2000. – 22 августа. – С. 1.

**Судебная** власть справила новоселье // Вечерний Брест. – 2000. – 23 августа. – С. 1.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынскі раённы суд

***Прадметы:***

Суды